# § 27. Асманская імперыя

**1520—1566 гг.** **1683 г.**

**Успомніце.** *Хто і калі заснаваў рэлігію іслам? Якія яе асаблівасці? Якія краіны ў Сярэднія вякі сталі мусульманскімі?*

У XVI–XVIII стст. Асманская імперыя з'яўлялася найбуйнейшаю дзяржавай мусульманскага свету. Яе гісторыя першапачаткова была цесна знітаваная з гісторыяй еўрапейскіх краін. Легендарным стваральнікам Асманскай імперыі быў правадыр цюркскіх плямёнаў бей (князь) Асман. У 1299 г. ён абвясціў незалежнасць сваёй маленькай краіны ад сельджукаў і прыняў тытул султана. Неўзабаве яму ўдалося заваяваць усю заходнюю частку Малой Азіі. Ім была заснаваная кіроўная дынастыя Асманаў. Такую ж назву атрымала дзяржава, створаная ў выніку шматлікіх войнаў.

**Вы даведаецеся.** *Калі Асманская імперыя дасягнула найвышэйшай магутнасці. Якая была роля ісламу ў жыцці мусульман. Чаму жывапіс і скульптура амаль не развіваліся ў мусульманскім свеце. Як змянілася становішча Асманскай імперыі пасля смерці Сулеймана I.*

274—276



Сулейман I Велічны. Мастак *Тыцыян*. 1530 г.

**1. «Залаты век» Асманскай імперыі.** У 1453 г. туркі-асманы захапілі сталіцу Візантыі — Канстанцінопаль. Пасля гэтага Асманская дзяржава стала называцца імперыяй. Перайменаваўшы Канстанцінопаль у Стамбул, заваёўнікі зрабілі яго сталіцай Асманскай імперыі.

Неўзабаве да яе былі далучаныя Грэцыя і Крым. Пасля заваявання Егіпта, Алжыра, Сірыі і Палесціны тэрыторыя імперыі павялічылася ўдвая.

Найбольшай магутнасці Асманская імперыя дасягнула пры ***Сулеймане I Велічным***. Таму яго кіраванне ў 1520—1566 гг. называюць «залатым векам». Сулейман працягнуў заваёўніцкія войны і далучыў да імперыі Венгерскае каралеўства, частку Харватыі і Персіі, а таксама Арменію і Месапатамію. Войскі ***янычараў*** нават аблажылі Вену — сталіцу Свяшчэннай Рымскай імперыі, але ўзяць горад не здолелі. Пад кантролем султана апынуліся землі трох частак свету (Еўропы, Азіі, Афрыкі) вакол Чорнага і Міжземнага мораў. Амаль усе арабскія краіны ўваходзілі ў склад Асманскай імперыі. На яе тэрыторыі жылі шматлікія і непадобныя адзін да аднаго народы: арабы, курды, берберы, албанцы, грэкі, славяне, венгры, румыны, армяне, грузіны і інш.

*Прывядзіце факты з тэксту параграфа, якія пацвярджаюць, што перыяд праўлення Сулеймана Велічнага можна назваць «залатым векам».*

278—280

Велізарныя багацці сцякаліся ў Турцыю, прычым не толькі ў выніку войнаў, але і дзякуючы гандлю, бо праз землі асманаў праходзілі гандлёвыя шляхі з Еўропы ў Азію. На рынках імперыі былі тавары з усяго свету: сукно з Англіі, шоўк з Персіі, фарфор з Кітая, прыправы з Індыі і краін Далёкага Усходу.

Квітнелі мастацтва, літаратура і архітэктура. Адукацыя была рэлігійнай, але віталіся такія навукі, як матэматыка і астраномія. Вялікіх поспехаў дасягнула медыцына. Султан асабіста апекаваўся мастацтвам і рамёствамі. У імперыі ўзводзіліся мячэці з купальнымі перакрыццямі і зграбнымі мінарэтамі.

**2. Роля ісламу.** Вялікую ролю ў жыцці мусульманскага грамадства адыгрываў іслам. Мусульмане мусілі выконваць пэўныя прадпісанні, выказваць пакорлівасць і цярплівасць, маліцца, трымаць пост, даваць міласціну, выпраўляцца ў паломніцтва ў святыя месцы. Іх рэлігійным абавязкам з'яўляўся джыхад— «свяшчэнная вайна» ў імя распаўсюджання або абароны ісламу.

Выкананне рэлігійных прадпісанняў лічылася богаўгоднаю справай. Яны ахоплівалі практычна ўсе сферы жыцця мусульманскай абшчыны: сямейна-бытавыя, маёмасныя, гандлёвыя, маральныя, прававыя і г. д. Так, напрыклад, іслам забараняў ужыванне свініны

і спіртных напояў. Нават прысутнасць пры застоллі, дзе ўжываўся алкаголь, лічылася цяжкім грахом. Ліхвярства і азартныя гульні таксама разглядаліся як заганныя і грахоўныя заняткі.

Іслам забараняў выяўляць людзей і жывёл. Таму жывапіс і скульптура не развіваліся. Выяўленчае мастацтва абмяжоўвалася арнаментам і каліграфіяй, якія дасягнулі неверагоднай дасканаласці.

Нават памеры падатку вызначаліся рэлігійнай прыналежнасцю. Мусульмане, напрыклад, вызваляліся ад падушнага падатку, у той час як падданыя-хрысціяне выплачвалі і падушны, і пазямельны падаткі.

*Складзіце схему «Рэлігійныя прадпісанні ісламу».*

**3. Вышэйшае ісламскае духавенства.** Крыніцай прадпісанняў і абмежаванняў быў Каран. Яго тлумачылі аўтарытэтныя знаўцы ісламу ўле́мы — навукоўцы-багасловы. Яны складалі асаблівую сацыяльную групу, якая адыгрывала важную ролю ў культурным і грамадска-палітычным жыцці мусульманскай абшчыны. Напрыклад, у Асманскай імперыі загады і новаўвядзенні султана лічыліся законнымі толькі пасля дазвольнага ўказа вышэйшага мусульманскага багаслова.

Улемы карысталіся правам асабістай недатыкальнасці, якога не мелі нават султаны. За ўсю гісторыю Асманскай імперыі, што праіснавала 500 гадоў, шмат якія правіцелі былі зрынутыя з трона і забітыя, многіх міністраў пазбавілі жыцця. І за гэты ж час пакаралі смерцю ўсяго двух вышэйшых мусульманскіх багасловаў.



Блакітная мячэць у Стамбуле. 1609–1616 гг.

**4. Стаўленне да Еўропы і еўрапейцаў.** Да еўрапейскай навукі, тэхнікі і культуры ўлемы ставіліся адмоўна. Усё, што зыходзіла ад «няверных», лічылася ерассю і доўгі час сустракала ўпартае супраціўленне духавенства і феадалаў. Імкненне засцерагчы мусульман ад сувязей з іншаверцамі вяло да ізаляцыі мусульманскага свету, што замінала асваенню мусульманскімі краінамі дасягненняў заходняй цывілізацыі.

Да XVIII ст. у Асманскай імперыі амаль не было друкаваных кніг праз непрыняцце іх мусульманскімі багасловамі. Хаця кнігадрукаванне развівалася зусім побач — у Еўропе. Мусульмане асвоілі яго амаль праз 300 гадоў пасля вынаходніцтва друкарскага варштата ў 1440-х гг.

*Уявіце, што вы — еўрапейскі падарожнік і трапілі ў Стамбул XVIII ст. Якія запісы ў сваім дзённіку вы зробіце? Якія асаблівасці жыцця мусульман адлюструеце ў сваіх нататках?*

Развіццю тэхнікі і прамысловасці ў мусульманскіх краінах перашкаджаў неабмежаваны дэспатызм цэнтральнага ўрада і феадалаў. Маёмасць маглі канфіскаваць з любой нагоды. Гандляры, у чыіх руках збіраліся велізарныя грашовыя сродкі, не хацелі ўкладваць іх у прамысловасць або банкаўскую справу. Яны лічылі за лепшае хаваць сваё багацце, ператвараючы яго ў скарбы.

**5. Заняпад Асманскай імперыі.** Пасля смерці Сулеймана Велічнага Асманская імперыя нядоўга захоўвала магутнасць. Ніводзін з султанаў-пераемнікаў не вылучаўся здольнасцямі і вартасцямі свайго вялікага папярэдніка. Усё большую ўладу набывалі кіраўнікі асобных правінцый. У Егіпце і Алжыры яны толькі фармальна падпарадкоўваліся турэцкаму султану. Міністры і военачальнікі султана вялі бяздзейнае жыццё і не надта пераймаліся дзяржаўнымі клопатамі.

Туркі-асманы па-ранейшаму ваявалі са сваімі суседзямі — Персіяй і аўстрыйскімі Габсбургамі, але няўдала. Апроч таго, ваенныя дзеянні вымагалі вялікіх выдаткаў, што аслабляла імперыю.

Першы трывожны сігнал прагучаў у 1571 г. Аб'яднаны флот Свяшчэннай Рымскай імперыі, Іспаніі і некалькіх італьянскіх дзяржаў нанёс знішчальнае паражэнне асманскаму флоту ў бітве пры горадзе Лепанта. Поўным разгромам турэцкага войска завяршылася другая аблога




Асманская імперыя ў XVI–XVIII стст.

аўстрыйскай сталіцы Вены ў ***1683 г.*** Пасля гэтага туркі ўжо больш не пагражалі Еўропе. На працягу ста гадоў яны ваявалі з Аўстрыяй і Расіяй, аддаючы ім усё новыя і новыя землі.

### Жанчына ў ісламскім грамадстве

Іслам замацаваў залежны стан жанчыны. Мусульманка не мела права выйсці замуж за іншаверца, тады як мужчына-мусульманін мог ажаніцца з жанчынай іншай веры.

Паўсядзённае жыццё мусульманкі абмяжоўвалася незлічонымі правіламі паводзін. Пры атрыманні маёмасці ў спадчыну дачцэ належала ўдвая менш, чым сыну, паколькі менавіта мужчыны мусілі ўтрымліваць сям'ю. Мужчыны карысталіся правам мнагажонства, яны ж лёгка маглі адмовіцца ад жонкі. Мужу было дастаткова тройчы сказаць «ты вольная», каб жонка назаўсёды пакінула дом. Аднак мужчыны ў мусульманскім грамадстве рэдка карысталіся гэтым правам.

*Такім чынам, у XVI—XVIII стст. Асманская імперыя перажыла перыяды росквіту і заняпаду. Пасля паражэння ў вайне з Расіяй напрыканцы XVIII ст. яна была блізкая да поўнага краху. Толькі супярэчнасці паміж еўрапейскімі дзяржавамі перашкодзілі апошнім падзяліць Асманскую імперыю на часткі.*

***Ключавыя словы:*** *Сулейман I Велічны, «залаты век», іслам, улемы.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Калі з'явілася Асманская імперыя і на якіх тэрыторыях яна ўтварылася?
**2.** У выніку чаго Асманская імперыя дасягнула найвялікшай магутнасці?
**3.** З якімі дзяржавамі Асманская імперыя найчасцей ваявала? Якія былі прычыны войнаў?
**4.** Ахарактарызуйце з дапамогай тэксту параграфа прычыны заняпаду Асманскай імперыі.
**5.** Складзіце разгорнуты план параграфа. Дайце новыя назвы яго пунктам.
**6.** Падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) пра мячэць Ахмедые ў Стамбуле.

## § 28. Японія

**1603 г.**

**Успомніце.** *Якая дзяржава называецца цэнтралізаванай? Як ставіліся да асобы і ўлады імператара ў сярэднявечнай Японіі? Якая рэлігія ў Японіі стала дзяржаўнай?*

Еўрапейцы лічылі Японію адсталаю дзяржавай. У сапраўднасці гэта была развітая і цывілізаваная краіна з багатай культурай і працавітым народам. У другой палове XV ст. буйны́я феадалы распачалі ў Японіі працяглую грамадзянскую вайну. Улада імператара аслабла. Нават галоўнакамандуючы японскай арміяй — ***сёгу́н*** — не мог паўплываць на ход падзей. Больш за сто гадоў самураі вялі міжусобныя войны, спусташаючы краіну.

**Вы даведаецеся.** *Асаблівасці развіцця Японіі ў першы перыяд Новага часу. Якія ўзаемаадносіны складваліся паміж Японіяй і краінамі Еўропы?*